батывать если не у школьников (система просвещения), то у студентов (система образования), причем не только историков (для них это неотъемлемая составляющая профессионализма), но и в рамках обязательного для всех получающих высшее образование в Российской Федерации курса «История России».


1. Анкерсмит, Ф. Нарративная логика: семантический анализ языка историков / Франк Анкерсмит. – Москва : Идея-Пресс, 2003. – 360 с.
2. Заседание дискуссионного клуба «Валдай» // Президент России : [сайт]. – URL: http://www.kremlin.ru/events/president/news/72444 (дата обращения: 17.09.2025).
3. Казаков, Р. Б. Научно-педагогическая школа источниковедения Историко-архивного института: эпистемологические основания, институциональное оформление / Р. Б. Казаков, М. Ф. Румянцева // Magistra Vitae: электронный журнал по историческим наукам и археологии. – 2023. – № 2. – С. 181–192.
4. Лаппо-Данилевский, А. С. Методология истории : [в 2 т.] / А. С. Лаппо-Данилевский. – Москва : Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), 2010. – Т. 2. – 631 с.
5. Мегилл, Ал. Историческая эпистемология / Аллан Мегилл. – Москва : «Канон+» РООИ «Реабилитация», 2007. – 480 с.
6. Медушевская, О. М. Теория и методология когнитивной истории / О. М. Медушевская. – Москва : Рос. гос. гуманит. ун-т, 2008. – 358 с.
7. Румянцева, М. Ф. Две стратегии освоения культурного наследия / М. Ф. Румянцева // Охрана и популяризация культурного наследия: мировой и отечественный опыт : материалы международной научно-практической конференции, Витебск, 22–23 октября 2021 г. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2021. – С. 155–159.
8. Румянцева, М. Ф. Освоение культурного наследия: стратегии в условиях столкновения/синергии цивилизаций / М. Ф. Румянцева // Охрана и популяризация культурного наследия: мировой и отечественный опыт : материалы II Международной научно-практической конференции, посвященной Году мира и созидания. Витебск, 26–27 октября 2023 г. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2023. – С. 218–221.
9. Теория и методология исторической науки : терминол. слов. / отв. ред. А. О. Чубарьян, Л. П. Репина ; РАН. Ин-т всеобщей ист. – 2-е изд., испр. и доп. – Москва : Аквилон, 2016. – 543 с.
10. Уайт, Х. Метаистория: Историческое воображение в Европе XIX века / Хейден Уайт. – Екатеринбург : Изд-во Уральского ун-та, 2002. – 527 с.
11. Шмидт, С. О. О классификации исторических источников // Вспомогательные исторические дисциплины. – Ленинград : Наука, 1985. – Вып. XVI. – С. 3–24.



**Сівохін Г.А.**


# МУЗЕІ-ЗАПАВЕДНІКІ ЯК СПЕЦЫФІЧНАЯ ФОРМА ЗАХАВАННЯ СПАДЧЫНЫ. КЕЙС ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАГА МУЗЕЯ-ЗАПАВЕДНІКА “ЗАСЛАЎЕ”


*Ключавыя словы:* гістарычна-культурныя каштоўнасці, музеі-запаведнікі, Гісторыка-культурны музей-запаведнік “Заслаўе”, горад-музей, гістарычная і культурная спадчына, Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь, музеефікацыя археалагічнай спадчыны.


Адным з найбольш амбітных праектаў у галіне гістарычнай спадчыны за часамі БССР, які пры гэтым уключаў у сябе музейны складнік, было стварэнне ў канцы 1960-х – пачатку 1970-х чатырох гістарычна-археалагічных запаведнікаў, якія ў той ці іншай ступені мусілі былі ўключаць гістарычныя часткі старадаўніх беларускіх гарадоў: Гродна, Пінск, Полацк і Заслаўе. Апошняе не выпадкава трапіла ў пералік такіх гістарычных тэрыторый – Заслаўе было ўключанае ў лік важнейшых гістарычных і археалагічных помнікаў з самых першых спробаў кадыфікацыі спадчыны ў БССР: яшчэ ў 1926 г. помнікі Заслаўя – царква Раства, царква Перамянення (Замкавая) і Заслаўскае замчышча, – пастановай Савета Народных Камісараў БССР ад 05.07.1926 “Аб аб’яўленні дзяржаўнай уласнасцю помнікаў старажытнасці, мастацтва, побыту і прыроды” былі ўключаныя ў спіс помнікаў Мінскай акругі [1].

Пастановай Савета Міністраў БССР ад 19.12.1950 зацверджаны пералік археалагічных помнікаў рэспубліканскага значэння на тэрыторыі БССР, куды былі ўключаныя і заслаўскія старажытнасці. Ужо існы спіс помнікаў быў пашыраны коштам некалькіх курганных груп [20].

На тэрыторыі гістарычнай часткі г. Заслаўя сёння размешчаныя наступныя гісторыка-культурныя каштоўнасці [9]: гістарычны цэнтр X–XVIII стст., касцёл нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі XVIII ст., музеефікаваныя экспазіцыйныя

аб’екты Запаведніка “Кузня” і “Этнаграфічны комплекс «Млын»”, Кальвінскі збор II п. XVI – п. XVII ст., заслаўскі замак X–XVIII стст., (Гарадзішча «Вал»), а таксама некалькі будынкаў кат. “3” к. XIX – п.п. XX ст.

Значным помнікам, размешчаным на тэрыторыі сучаснага горада, але па-за гістарычнай яго часткай, з’яўляецца гарадзішча “Замачак” др.п. X–XI ст., а таксама парэшткі сядзібы Заслаў. Апрача таго на тэрыторыі Запаведніка як у межах сучаснага горада, так і ў непасрэдна за яго межамі размешчаныя шэраг курганных груп. Усе гэтыя гістарычна-культурныя помнікі былі ўключаныя ў склад Запаведніка пры яго ўтварэнні ў 1967 і/або рэарганізацыі ў 1986–1990.

У адпаведнасці з сумеснай Пастановай Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і Савета Міністраў Беларускай ССР ад 19 верасня 1967 г. было аб’яўлена аб стварэнні чатырох гісторыка-археалагічных запаведнікаў на тэрыторыі Беларусі [8]. Сярод іншых запаведнікаў згодна з пунктам “г” артыкула 8 дадзенай пастановы быў абвешчаны і запаведнік у Заслаўі, у склад якога ўвайшлі “Старажытнае гарадзішча ў комплексе з Прэабражэнскай цэрквай і магілай Рагнеды” [8, с. 567], г.зн. сучасныя гарадзішча “Вал”, былы кальвінскі збор і гарадзішча “Замачак”.

Згодна з пунктам “г” артыкула 2 дадзенай пастановы неабходна было забяспечыць больш рацыянальнае выкарыстанне будынкаў помнікаў архітэктуры, прыстасаваўшы тыя галоўным чынам пад музеі, бібліятэкі, дамы адпачынку і г.д. [8, с. 566]. Дадаткам 2 да Пастановы былы кальвінскі збор, у якім на той момант быў размешчаны склад райхарчгандлю, быў уключаны ў пералік помнікаў архітэктуры, якія вымагалі змянення характару іх выкарыстання [16, с. 292].

У адпаведнасці з пунктам 1 палажэння “Об историко-археологических заповедниках”, зацверджаным Міністэрствам культуры БССР 8.10.1968, гістарычна-археалагічныя запаведнікі дзейнічалі ў форме філіялаў музеяў [19, с. 331]. Работа заслаўскага гістарычна-археалагічнага запаведніка была арганізаваная як філіяла Дзяржаўнага музея БССР (цяпер – Нацыянальны гістарычны музей) і ў 1977–1988 гг. у памяшканні былога кальвінскага збору была адкрыта экспазіцыя філіяла Дзяржмузея – “Музей рамёстваў і народных промыслаў”.

Пастановай Савета Міністраў БССР ад 31 снежня 1986 г. было прынятае рашэнне аб стварэнні гістарычна-культурнага запаведніка “Заслаўе” [12]. Запаведнік як комплекс помнікаў гісторыі і культуры горада быў абвешчаны як установа рэспубліканскага значэння, таксама было вызначанае, што ён знаходзіцца ў падпарадкаванні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта. Гістарычна-культурны запаведнік “Заслаўе” быў утвораны на базе філіяла Дзяржмузея БССР. У адпаведнасці з загадам Міністэрства культуры БССР у склад Запаведніка быў прыняты філіял Дзяржмузея БССР у Заслаўі: новастворанай установе былі перададзеныя памяшканні экспазіцыі “Музей рамёстваў і народных промыслаў”, часткова – матэрыяльная база, а таксама склад супрацоўнікаў быў уключаны ў калектыў Запаведніка [10].

Пастановай Савета Міністраў БССР ад 13 верасня 1990 г. былі вызначаныя пералік аб’ектаў, якія ўваходзілі ў склад Запаведніка, мэты і задачы, функцыі, правы, паўнамоцтвы і кантрольныя функцыі, а таксама, што самае галоўнае, межы Запаведніка, яго зоны аховы і рэжым іх утрымання [17].

У склад Запаведніка былі ўключаныя гарадзішча “Вал”, былы Кальвінскі збор, гарадзішча “Замачак”, курганныя могільнікі X–XI стст., касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі, парэшткі сядзібы “Заслаў” XVII–XVIII стст., планіровачная структура вуліц XII–XVIII стст.

Згодна з дадаткам 1 да пастановы таксама былі вызначаныя межы ахоўнай зоны Запаведніка, якая ўключала ў сябе зону гістарычнага цэнтру, гарадзішча “Замачак” і курганных могільнікаў. Згодна з дадаткам 2 да азначанай пастановы былі вызначаныя межы зон рэгулюемай забудовы і ахоўваемага прыроднага ландшафту Запаведніка.

Пастанова Савета Міністраў БССР ад 13 верасня 1990 г. грунтавалася на распрацоўках, выкананых Беларускім спецыялізаваным інстытутам па распрацоўцы праектнай дакументацыі для рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры "Белспецпраектрэстаўрацыя" і Беларускім спецыялізаваным навукова-рэстаўрацыйным вытворчым аб'яднаннем "Белрэстаўрацыя". Па заказе Заслаўскага гарвыканкама ў 1989 г. быў распрацаваны праект меж зон адмысловага рэжыму рэканструкцыі [21].

У рамках правядзення даследавання быў праведзены аналіз успрыняцця гарадскога ландшафту і абгрунтаванне меж і рэгламентацыя далейшай забудовы зон адмысловага рэжыму. У 2011 г. было распрацаванае, зацверджанае навукова-метадычнай радай Запаведніка і ўзгодненая Мінскім раённым выканаўчым камітэтам палажэнне "Аб рэжыме ўтрымання і выкарыстання зон аховы комплексу нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў ДУ «Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе»" [18]. Неабходнасць распрацоўкі дадзенага дакумента, які не проста паўтараў і зводзіў у адно цэлае, але і дэталізаваў і канкрэтызаваў патрабаванні да ўтрымання рэжымаў ахоўных зон Запаведніка, а таксама прапісваў працэдуру ўзгаднення правядзення работ на аб'ектах Запаведніка, было выкліканае адсутнасцю распрацаванага праекта зон аховы (далей – ПЗА) на аб'екты Запаведніка.

Праблемная сітуацыя з межамі і рэжымамі ўтрымання і распрацоўкі ПЗА была выкліканая тым, што беларускае заканадаўства ўтрымлівала і да сённяшняга моманту працягвае ўтрымліваць казус, звязаны з аб'ектамі гістарычна-культурнай спадчыны і іх музеефікацыяй ў форме стварэння музеяў-запаведнікаў.

Як у музейным заканадаўстве 1990-х – 2000-х гг., так і сёння ў адпаведнасці з дзеючым Кодэксам Рэспублікі Беларусь "Аб культуры" музеі-запаведнікі маюць уяўляць комплексы і ансамблі нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў разам з тэрыторыяй, гістарычна і культурна звязанай з імі [2; 7], альбо, у версіі Кодэкса "Аб культуры", музеі-запаведнікі "размяшчаюцца ў комплексных гісторыка-культурных каштоўнасцях, разам з тэрыторыяй, гістарычна і культурна звязанай з імі" [6].

Аднак згодна з заканадаўствам аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны – і колішнім законам аб яе ахове, і дзеючым на сённяшні момант Кодэксам, – уключэнне пэўных аб'ектаў і/або прадметаў у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны – самастойная працэдура, якая рэгулюецца выключна законам аб ахове спадчыны (да прыняцця кодэкса), альбо адпаведным раздзелам кодэксу [2, 6].

Такім чынам і паўстае дадзены казус: ці павінныя пасля прыняцця пастановы Саветам Міністраў усе аб'екты, абвешчаныя запаведнымі, аўтаматычна ўключацца ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў ці, наадварот, Савет Міністраў мае права абвяшчаць запаведнікамі толькі тыя аб'екты, якія ўжо ўключаныя ў Дзяпржспіс? Асобна стаіць і пытанне пра тыя аб'екты, якія ўключаныя ў Дзяржспіс і размешчаныя на тэрыторыі запаведніка, але не абвешчаныя Саветам Міністраў яго складовай часткай. У выпадку з Заслаўем шэраг аб'ектаў на тэрыторыі Запаведніка, уключаныя ў Дзяржспіс, у яго не ўваходзілі, яму не належылі і намінальна не былі ўключаныя ў яго склад.

Існаванне такога казусу пацягнула за сабой магчымасць "неадпаведнага" выкарыстання аб'ектаў культурнай спадчыцны на тэрыторыі Зпаведніка, а таксама магчымасць іх выключэння з Дзяржспісу без кансультацый і ўзгаднення з Запаведнікам, правядзення на іх работ і г.д., хаця ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў усе работы на тэрыторыі маглі праводзіцца выключна з дазволу Міністэрства культуры пры папярэднім узгадненні з Запаведнікам [17].

У выніку былі пазбаўленыя ахоўнага статусу і выключаныя з Дзяржспіса шэраг аб'ектаў, а таксама былі зменены ахоўныя зоны гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

Так, у розны час пазбаўленыя ахоўнага статусу былі наступныя будынкі канца XIX – I паловы XX ст.: вул. Бялова, д. 22, вул. Паштовая, д. 11, д. 12, д. 14, вул. Вакзальная, д. 6, вул. Вялікая, д. 10, д. 21, вул. Савецкая, д. 34, д. 36, д. 45, д. 47, д. 49.

Таксама з Дзяржспісу былі выключаныя чатыры курганы, размешчаныя непадалёк ад гарадзішча “Замачак” – у сувязі з іх “археалагічнай вывучанасцю” або знішчэннем [3].

Вядома, у шэрагу выпадкаў пытанні магло выклікаць само ўключэнне некаторых з вышэй пазначаных аб’ектаў у Дзяржспіс, аднак юрыдычны казус уключаў іх у шэрую зону ў пэўных аспектах і дазволіў выключыць з Дзяржспісу, не ўлічваючы пазіцыю Запаведніка.

Больш за тое, гэты юрыдычны казус і прывёў да фактычнага знікнення музеяў-запаведнікаў у Беларусі як спецыфічных установ, якія з’яўляюцца адначасова і музеямі, і адміністратарамі аб’ектаў гістарычнай і культурнай спадчыны на пэўнай тэрыторыі.

Так, у 2016 г. была прынятая пастанова Савета Міністраў, паводле якой пастанова ад 13 верасня 1990 г. страціла сілу [14]. Гэтай жа пастановай была адмененая і пастанова аб “О Полоцком историко-культурном заповеднике” [13]. Гэты было вынікам таго, што Кодэкс Рэспублікі Беларусь “О земле” разглядае запаведнікі выключна як катэгорыю зямель прыродаахоўнага прызначэння. У выніку гісторыка-культурныя музеі-запаведнікі – Заслаўскі і Полацкі, – у Рэспубліцы Беларусь канчаткова спынілі сваё існаванне (Нясвіжскі спыніў сваё існаванне яшчэ раней, у 2007 г. [11]). Фактычна, на засталося гісторыка-культурных музеяў-запаведнікаў у тым значэнні, у якім іх разумее Кодэкс Рэспублікі Беларусь “Аб культуры” (артыкул 166). Засталіся толькі музейныя ўстановы – юрыдычныя асобы, якія ў сваёй назве ўтрымліваюць тэрмін “гісторыка-культурны музей-запаведнік”.

У рамках выканання даручэння Міністэрства культуры па распрацоўцы прапаноў па ўдакладненню межаў і складу гістарычнага цэнтру г. Заслаўя ў рамках распрацоўкі генеральнага плана горада [15] Запаведнікам былі распрацаваная перадпраектная дакументацыя “Межы і склад гістарычнай часткі (гістарычнага цэнтра) г. Заслаўя X–XX стст.” [22]. Дакументам абгрунтоўвалася неабходнасць не толькі захваць межы гістарычнага цэнтру, але і пашырыць іх: у сувязі з вышэйпазначаным казусам межы гістарычнага цэнтру горада былі значна меншыя за ахоўваемыя тэрыторыі з запаведным статусам. Фактычна іх, за некаторымі выключэннямі, прапаноўвалася атаясаміць. З мэтай распрацоўкі агульных зон аховы на гісторыка-культурныя каштоўнасці Заслаўя прапаноўвалася змяніць межы Гістарычнага цэнтра, уключыўшы ў іх тэрыторыю загараднай сядзібы Заслаў, у тым ліку будынак былога флігеля палаца Пшаздзецкіх, гісторыка-культурную каштоўнасці – будынкі канца XIX ст., шыфры 613Г000325 і 613Г000326 і інш., а таксама павялічыць тэрыторыю Гістарычнага цэнтру ў паўднёвы бок уздоўж вул. Вялікай, уключаючы Чорную гару (Трусаву гару), будынак сядзібнага дому пачатку XX ст. па вул. Вялікай, д. 31, а таксама гісторыка-культурную каштоўнасць – будынак, шыфр 613Г000327, 1933. Аднак прапановы Запаведніка нават не былі прынятыя да разгляду, а зацверджаныя змяненні ў выніку нават паменшылі тэрыторыю гістарычнага цэнтру [4].

Не менш пытанняў выклікае і зацверджаны праект зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў, размешчаных у цэнтральнай частцы г. Заслаўе [5]: апрача неўключэння ў ПЗА шэрагу значных аб’ектаў, у тым ліку ахоўным статусам, найбольшую занепакоенасць выклікае колішняя тэрыторыя рэгулявання забудовы і ахоўваемага прыроднага ландшафту Запаведніка.

Паўднёва-заходняя зялёная зона Гістарычнага цэнтру “Лугапарк II”, уключаная ў зону ахоўваемага ландшафту Гістарычнага цэнтра, была сфарміраваная як працяг зялёнай зоны, які атачае гістарычную частку г. Заслаўя, уключаючы непасрэдна Гістарычны цэнтр, а таксама нерухомую матэрыяльную гісторыка-культурную каштоўнасць “Гарадзішча Замэчак”: “У месцах, пазначаных на схеме, фарміруецца закрыты тып ландшафту для стварэння своеасаблівых «куліс» зрокавай сувязі «Замэчак – Замчышча». Кулісамі могуць служыць вялікія курціны альбо насаджэнні з высокага кустоўя альбо аднапародных дрэваў” [8, с. 30].

Цяпера жа, згодна з новым генеральным планам горада, гэтая тэрыторыя мае быць аддадзеная пад забудову і пры ўездзе ў горад людзей будзе спатыкаць не маляўнічы гістарычны ландшафт, а сучасная забудова жылых кварталаў.

Больш за тое, беспадстаўна выведзеныя з Дзяржспісу будынкі заслаўскай карчмы, крамы і кашараў пагранатраду ў 2025 у рамках "работ па добраўпарадкаванню" тэрыторыі горада пры падрыхтоўцы да мінскага абласнога "Свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2025»", былі знішчаныя, а сама тэрыторыя гістарычнага цэнтру падвергнутая значным змяненням.

Такім чынам, можна канстатаваць, што працяглая наяўнасць у беларускім заканадаўстве казуса, які дазваляе дваяка трактаваць пытанні аховы спадчыны ў выніку пэўнага зазору паміж раздзеламі, прысвечанымі музейнай справе, а, менавіта, музеям-запаведнікам, з аднаго боку, і ахове гісторыка-культурнай спадчыны – з другога, прыводзіць да сітуацыі, калі музеі-запаведніка фактычна не могуць выконваць ускладзеных на іх функцый. Больш за тое, на сённяшні дзень у Беларусі не засталося музеяў-запаведнікаў, а ёсць толькі юрыдычныя асобы, якія ўтрымліваюць у сваёй назве такое словаспалучэнне.


1. Аб аб'яўленні гісторыка-культурнага запаведніка «Заслаўе», Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка і Нацыянальнага гісторыка-культурнага запаведніка «Нясвіж» гістарычна-культурнымі музеямі-запаведнікамі : пастанова Савета Міністраў, 22 мая 1997, № 553 // ЭТАЛОН. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь / Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь. – Мінск, 2023.
2. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь ад 9 студзеня 2006 г. № 98-З // ЭТАЛОН : інфарм.-пошукавая сістэма (дата звароту: 01.09.2025).
3. Аб гісторыка-культурных каштоўнасцях : пастанова Міністэрства культуры ад 20.08.2021 № 55 // ЭТАЛОН : інфарм.-пошукавая сістэма (дата звароту: 01.09.2025).
4. Аб гісторыка-культурных каштоўнасцях : пастанова Міністэрства культуры ад 27.12.2024 № 187 // ЭТАЛОН : інфарм.-пошукавая сістэма (дата звароту: 01.09.2025).
5. Аб зацвярджэнні праекта зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, размешчаных у цэнтральнай частцы г. Заслаўе Мінскага раёна Мінскай вобласці : пастанова Міністэрства культуры ад 11.03.2025 № 16 // ЭТАЛОН : інфарм.-пошукавая сістэма (дата звароту: 01.09.2025).
6. Аб культуры : кодэкс Рэсп. Беларусь ад 20 ліпеня 2016 г. № 413-З // ЭТАЛОН : інфарм.-пошукавая сістэма (дата звароту: 01.09.2025).
7. Аб музеях і Музейным фондзе : Закон Рэсп. Беларусь ад 12 снежня 2005 г. № 70-З // ЭТАЛОН : інфарм.-пошукавая сістэма (дата звароту: 01.09.2025).
8. Аб стане і мерах паляпшэння аховы помнікаў гісторыі, мастацтва і архітэктуры ў Беларускай ССР : Пастанова Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і Савета Міністраў Беларускай ССР ад 19 верасня 1967 № 318/386 // Збор законаў, указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, Пастаноў і Распараджэнняў Савета Міністраў Беларускай ССР. – 05.10.1967. – № 28. – С. 565–568.
9. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. – URL: http://gosspisok.gov.by/ (дата звароту: 26.09.2023).
10. Загад па Дзяржаўным гісторыка-культурным запаведніку "Заслаўе" ад 13.10.1988 № 16 // Навуковы архіў Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе".
11. О внесении изменения в постановление Совета Министров Республики Беларусь от 3 июня 1997 г. № 639 и признании утратившими силу некоторых постановлений Правительства Республики Беларусь и их отдельных положений : постановление Совета Министров БССР, 14 ноября 2007, № 1511 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2023.
12. О мерах по дальнейшему развитию г. Заславля и создании в нем историко-культурного заповедника : постановление Совета Министров БССР, 31 дек. 1986 г., № 394 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2023.
13. О Полоцком историко-культурном заповеднике : постановление Белорусской ССР, 16 июля 1990, № 158 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2023.
14. О признании утратившими силу некоторых постановлений Правительства Республики Беларусь и их отдельных структурных элементов: постановление Совета Министров, 4 февраля 2016, № 98 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2023.
15. О принятии мер реагирования : ліст Міністэрства культуры ад 31.08.2023 № 04-10/7617 // Навуковы архіў Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе".
16. О состоянии и мерах улучшения охраны памятников истории, искусства и архитектуры в Белорусском ССР : Постановление ЦК КП Белоруссии и Совета Министров Белорусской ССР от 19 сентября 1967 года № 318 // Советское законодательство о памятниках истории и культуры : Сборник документов и материалов (1917–1972 гг.). – Минск, 1972. – С. 286–292.
17. Об историко-культурном заповеднике "Заславль" : постановление Совета Министров БССР, 13 сентября 1990, № 234 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2023.
18. Палажэнне аб рэжыме ўтрымання і выкарыстання зон аховы комплексу нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў ДУ "Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе" : [зацверджанае навукова-метадычнай радай ДУ "ГКМЗ "Заслаўе", пратакол пасяджэння ад 20 кастрычніка 2011 № 2] // Навуковы архіў Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе".
19. Положение об историко-археологических заповедниках : Утверждено Министром культуры БССР по согласованию с юридической комиссией при Совете Министров БССР и исполкомами областных Советов депутатов трудящихся 8 октября 1968 года // Советское законодательство о памятниках истории и культуры : Сборник документов и материалов (1917–1972 гг.). – Минск, 1972. – С. 331–332.
20. Постановление Совета Министров БССР от 19.12.1950 № 1629 // Советское законодательство о памятниках истории и культуры : Сб. документов и материалов (1917–1972). – Минск : Полымя, 1972.
21. Проект границ зон особого режима реконструкции / Белреставрация ; Белспецпроектреставрация. – Минск, 1989. – Раздел 4 : Об'ект "Историко-культурное и инженерное обоснование регенерации исторической застройки г. Заславль" // Навуковы архіў Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе".
22. Сівохін, Г. А. Межы і склад гістарычнай часткі (гістарычнага цэнтра) г. Заслаўя X–XX стст. : перадпраектная дакументацыя / Г. А. Сівохін, К. У. Сямашка ; Гіст.-культ. муз.-зап. "Заслаўе". – Заслаўе : ГКМЗ "Заслаўе", 2023. – 110 с.